# РЭЦЭНЗІЯ

## НАСТОЛЬНАЯ КНІГА БАЦЬКОЎ

## DESK BOOK OF ANCESTORS

**І. І. Калачова,**
*Ад добрага кораня – добры парастак / І. І. Калачова. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2018. – 176 с.*

**I. Kalachova,**
*Ad dobraga koranya – dobry parastak / I. I. Kalachova. – Minsk : Belarus. encykl., 2018. – 176 p.*

Праблема выхавання дзіцяці заўсёды знаходзіцца ў эпіцэнтры грамадскай увагі і асабістых інтарэсаў ці не кожнага чалавека, не страчвае вастрыні і актуальнасці на працягу стагоддзяў. Манаграфія доктара гістарычных навук І. І. Калачовай «Ад добрага кораня – добры парастак» з'яўляецца каштоўным унёскам у распрацоўку гэтага «вечнага» пытання. Кніга, у якой актуалізаваны і адаптаваны для рэалій XXI стагоддзя лепшыя набыткі беларускай этнапедагогікі, прапанаваны канкрэтныя спосабы і прыёмы перанясення традыцыйнага выхаваўчага вопыту ў сучасную сям'ю, будзе, напэўна, адным з самых запатрабаваных мінулагодніх выданняў серыі «Ганаруся табой, Беларусь».

Граматная і карэктная манера прад'яўлення матэрыялу – захаванне аптымальнага балансу навуковасці і папулярнасці – садзейнічае задавальненню запытаў шырокай і дастаткова разнароднай чытацкай аўдыторыі.

Навуковы складнік найбольш выразны ў першым раздзеле «Сямейныя традыцыі беларусаў у XIX – пачатку XX ст.», які ўяўляе сабой адначасова і сур'ёзны тэарэтычны падмурак выкладзенай у кнізе выхаваўчай канцэпцыі, і займальны «экскурс у гістарычнае мінулае» (с. 10). Гісторыка-этнаграфічныя звесткі добра ўспрымаюцца, дзякуючы не толькі навукова-папулярнаму стылю аповеду, але і структуры раздзела: тэкст размежаваны на невялікія параграфы, прысвечаныя асобным пытанням (напрыклад, «Традыцыйная сям'я беларусаў», «Месца пражывання сям'і», «Бацька ў сям'і», «Бабулі і дзядулі як носьбіты традыцый» і інш.). Падобная структура – падзел на адносна самастойныя ў сэнсавых адносінах параграфы – захоўваецца ва ўсёй кнізе і дазваляе пры неабходнасці аператыўна знайсці патрэбную інфармацыю. Так, напрыклад, звярнуўшыся да параграфаў «Хрэсьбіны», «Каляды», «Грамніцы», можна даведацца пра асаб-лівасці адпаведных народных свят без паглыблення ў змест раздзела.

Вылучаюцца тры прадметна-тэматычныя блокі: «Сям'я беларусаў, уклад яе жыцця і побыт», «Традыцыі выхавання» і «Беларускае слова як выток выхавання». У першым створана вычарпальная карціна жыцця патрыярхальнай сям'і, выяўлена іерархія яе членаў, паказаны ўзаемаадносіны паміж імі, звернута асобная ўвага на галоўныя святы каляндарна-абрадавага цыкла, на рэгіянальныя звычаі і традыцыі. У другім робіцца большы акцэнт на педагагічны складнік сямейнага жыцця – разглядаюцца асаблівасці маральнага, эстэтычнага, духоўна-рэлігійнага, патрыятычнага, інтэлектуальнага сямейнага выхавання беларускіх дзяцей у папярэднія стагоддзі. Параграфы трэцяга блока даюць уяўленне пераважна пра выхаваўчы патэнцыял фальклорных твораў (калыханак, лічылак, забаўлянак, казак).

Апеляцыя да вядомых этнографаў мінулага (М. Я. Нікіфароўскага, М. Ф. Доўнар-Запольскага, А. Я. Багдановіча) і сучасных вучоных-педагогаў (Г. П. Арловай), ілюстраванне палажэнняў пра сямейны мікраклімат і прынцыпы выхавання беларусаў прыкладамі з твораў класікаў (Цёткі, І. Мележа, У. Караткевіча), успамінамі пажылых вяскоўцаў робяць «гістарычны экскурс» доказным, займальным, жывым. Акрамя таго, ні адзін параграф не абыходзіцца без фальклорных твораў ці ўрыўкаў з іх – прыказак, прымавак, пацешак, песень і інш., – у якіх сканцэнтраваны шматвяковы выхаваўчы вопыт і артыкуляваны галоўныя прынцыпы этнапедагогікі.

Не ўсе пастулаты народнай педагогікі можна і патрэбна выкарыстоўваць у XXI стагоддзі з прычыны іх катэгарычнасці і безапе-

Рэпазіторый БДПУ

ляцыйнасці (звычайнай з'явай выступае, напрыклад, фізічнае пакаранне, цкаванне незаконнанароджаных). Імпануе тое, што аўтарытарныя прынцыпы этнапедагогікі дэмакратызуюцца і гуманізуюцца аўтарам, што выяўляецца ў асобных рэмарках па тэксце, пытаннях і заданнях праблемнапошукавага характару з рубрыкі «Развагі ў вольную хвілінку...». Змешчаныя пасля параграфаў, такія пытанні і заданні даюць магчымасць адаптаваць прачытанае пад сябе – з улікам уласнага жыццёвага досведу, светапоглядных установак.

У другім раздзеле «Школка маладых бацькоў» прадстаўлены шматлікія ўнікальныя аўтарскія заданні, гульні, пазнавальна-забаўляльныя праграмы для дашкольнікаў рознага ўзросту. Раздзел надзвычай інфармацыйна і метадычна насычаны: тут змешчаны метадычныя парады і рэкамендацыі («Куфэрачак парад для матуль і для тат»), міні-слоўнікі («Тлумачальны слоўнік сваяцкіх адносін чалавека», «Слоўнік ласкавых зваротаў», «Слоўнік сваяцкіх эпітэтаў» і інш.), моўныя практыкаванні (пацешкі, заклічкі, забаўлянкі, калыханкі).

У трэцім раздзеле «Вясёлкавы карагод дзіцячых прыгод» прапануюцца сцэнарыі займальных дзіцячых свят і мерапрыемстваў, гульняў і віктарын. Чытабельнасці кнігі спрыяе і выдатнае мастацкае аздабленне: усе палажэнні тэксту суправаджаюцца багатым ілюстрацыйным матэрыялам – якаснымі архіўнымі і сучаснымі фотаздымкамі, яркімі тэматычнымі малюнкамі.

Прадстаўлены ў практычных раздзелах матэрыял, несумненна, будзе запатрабаваны шырокім колам чытачоў: кніга спатрэбіцца «маладым бацькам для сумеснага чытання і абмеркавання з дзецьмі, бабулям і дзядулям, выхавальнікам дзіцячых садоў, школьным сацыяльным педагогам для ўключэння ў праграму вучэбна-выхаваўчай дзейнасці, усім, хто цікавіцца багатай этнапедагагічнай спадчынай Беларусі» (с. 4). З увядзеннем у школьныя праграмы факультатыву «Асновы сямейнага жыцця» аўдыторыя патэнцыйных чытачоў кнігі І. І. Калачовай павялічыцца за кошт старшакласнікаў і настаўнікаў.

Манаграфія «Ад добрага кораня – добры парастак» мае ўсе шанцы на тое, каб стаць настольнай кнігай у маладых беларускіх сем'ях. Дзякуючы ёй сучасныя бацькі змогуць далучыцца самі і далучыць сваіх дзяцей да народных традыцый, закласці на іх аснове ўласныя.

**Н. В. Заяц,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ*

**N. Zayats,**
*PhD in Philology, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature, BSPU*

Рэпазіторый БДПУ